УДК 398.432

*Т.І.БАЛДЫШЭЎСКАЯ*

# РУСАЛКА – ТАЯМНІЧЫ ВОБРАЗ ДЭМАНАЛАГІЧНАЙ ІСТОТЫ

Беларусь, як і іншыя народы, памятае яшчэ некаторых сваіх міфалагічных бажкоў. Русалкі, калі жыта красуе ў полі, з распушчанымі доўгімі валасамі гушкаюцца на бярозках і співаюць песні; іхні смех адгукаецца ў глыбіні лясоў і трывогай працінае тых, хто збірае грыбы або ягады... [1, с.16].

Прыгожай, таямнічай, прывабнай і ў той жа час жорсткай паўстае з глыбінь народных уяўленняў русалка – вобраз, у якім перапляталіся разам і далёкі архаічны час язычніцкай веры беларусаў, і ўплыў хрысціянскай рэлігіі.

Звярнуўшыся да тлумачальных слоўнікаў, чытаем, што "русалка – міфалагічны вобраз усходнеславянскіх народаў у выглядзе жанчыны з доўгімі

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

распушчанымі валасамі, якая жыве ў вадзе або жыце" [22, с.728], "казачная жыліца водаў" [8, с.114], "істота, якая жыве ў вадзе ў вобразе голай жанчыны з доўгімі распушчанымі валасамі і рыб'ім хвастом" [19, с.980].

Корань і паходжанне слова русалка вызначыць складана. У нас ёсць слова *русый, русло, руса*. У санскрыце *rasa* – вадкасць, вільгаць, вада; у нямецкай *rus, ros* – возера, сажалка; у лацінскай *ros* – раса [7, с. 63].

Не зразумела сама назва "русалка", побач з якой у народзе жывуць і іншыя: купалка, вадзяніца, ласкатуха, мавка...Само слова "русалка", як указваў Міклошыц, пазнейшага паходжання і звязана з русаліямі.

Гэта не супярэчыць сцвярджэнню старажытнасці самога вобраза, бо назва гэта знайшла адлюстраванне ў старажытных уяўленнях аб лясных, палявых, вадзяных дэманалагічных вобразах жаночага пола [15, с.46].

"У рускіх сярэдневяковых крыніцах ёсць слова "русаліі", але няма "русалак", гэта слова суадносна заменена словам "вілы", а ў этнаграфічных матэрыялах, наадварот, шырока вядомы русалкі і няма віл. Некаторыя павучанні супраць язычніцтва пачыналі пералік багоў язычніцкіх, якіх шанавалі хрышчоныя рускія людзі, не з вярхоўнага Перуна, а з русалак: "Тем же богам требу кладуть и творять и словеносный язык, вилам и Мокошьи – Диве, Перуну, Хорсу...". Іншы раз колькасць віл – "30 сестрениць" (радзей 4 або 9). Хрысціяне "...веруюць в Перуна и Хорса и в Мокошь и в (Симарьгла) и в вилы, их же числом 30 сестрениць. Глаголють бо невегласи то все мнять богынями и тако покладывають им требы и кур им режуть" [17, с.582-583].

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што вілы-русалкі займаюць важнае месца ў сістэме аграрных культаў, якім пакланяліся і рабілі ахвярапрынашэнне нашы продкі.

У многіх народаў існавала павер'е, што нельга гнявіць духаў вады, пагэтаму людзей, якія тапіліся, баяліся выратоўваць. Індусы і жыхары Малайскага архіпелага лічылі: той, хто выратуе тапельца, у хуткім часе ўтопіцца сам. І калі б чалавек упаў у ваду ў прысутнасці іншых, замест дапамогі яны патапілі б яго, паколькі лічылі, што вадзяныя духі прымаюць і патрабуюць ахвяр.

Пры даследаванні звычаяў ахвярапрынашэнняў аказваецца, што звычайны спосаб прынясення ахвяры калодзежу, рацэ, возеру ці мору заключаецца проста ў тым, што рэч, жывёлу або чалавека кідалі ў ваду, якая павінна сама або праз духа, які ў ёй жыве, завалодаць імі [21, с.89]. Менавіта такой здабычай вады лічылі чалавека, які выпадкова ўтапіўся.

У Германіі, калі хто-небудзь тапіўся, людзі ўспаміналі рэлігію сваіх продкаў і гаварылі: "Рачны дух патрабаваў сваю штогадовую ахвяру", або прасцей: "Нікс узяў яго" [21, с.89].

Розныя меркаванні маюць месца пры разглядзе паходжання слова "русалка". Зыходзячы з таго, што нашым продкам русалка ўяўлялася часцей за ўсё прыгажуняй з русымі валасамі, можна меркаваць, што слова "русалка" паходзіць ад "русы" ("светлы, ясны"). Паколькі адным з месц, дзе жылі гэтыя істоты, былі рэкі, паняцце "русалка" магло паходзіць і ад "русло" (рачны) – паглыбленне ў глебе, па якім цячэ водны паток.

Русалкі ў народзе асэнсоўваліся і як духі раслліннасці, якія ўплывалі на ўрадлівасць нівы. Праследжваецца ўзаемасувязь "русалка" – "раса".

Ці не з аднаго кораня назвы кроплі вільгаці жывое і кветкі, што п'е – мацуецца гэтай вадкасцю? Тады і кінутая калісь богам Пеклам у апраметную (куды сыходзяць нябожчыкі) міфічная красуня Рось таксама да ружы-расы мае дачыненне. І вяртаецца яна штогод на Радаўніцу на зямлю, каб расказаць жывым пра радасць таго, адмежаванага, жыцця.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Нашы сучасныя словы "арасіць", "арашэнне" таксама выражаюць ідэю паліва пасеваў пры дапамозе кораня "рас" [17, с.675]. С.А.Токараў лічыў, што «зараз, аднак, можна лічыць даказаным, што слова гэта не славянскага, а лацінскага паходжання ад кораня "*ros*" [24, с.212].

Сам корань "*ros*" выводзілі з лацінскай назвы антычнага свята руж [роз], звязанага з культам продкаў, – rosaria, rosalia, dies rosae. І цяпер у славянскай міфалогіі абрадавыя ігрышчы носяць назву "русаліі". Акрэсліваецца ланцуг узаемасувязі: ros – rosalia – русаліі – русалка. Зразумела, што кожнае меркаванне слушнае, паколькі адлюстроўвае пэўнае ўяўленне пра русалку. Бо гэты міфалагічны персанаж увабраў у сябе вобраз захавальніцы і падаўцы ўрадлівасці, аднаго з апекуноў пладаноснай зямлі і распарадчыкаў воднай стыхіі, уяўляе сабой вобраз – увасабленне продкаў. Вытокі вераванняў у русалак вельмі старажытныя.

Уяўленні аб гэтых дэманалагічных істотах звязаны са славянскімі вераваннямі ў добрых і злых духаў вады і ўрадлівасці. Абрады з русалкамі арганічна ўваходзілі ў веснавое свята расліннасці, завяршаючы сабой пераход ад вясны да лета. Таму вялікае значэнне святу ў гонар русалак (русаліям) і надавалі язычнікі. Б.Рыбакоў адзначаў, што русаліі звязаны з урадлівасцю палёў, маленнем пра дождж і нараджэннем новых калоссяў.

Прадстаўленні аб фізічных і духоўных якасцях русалак на Палессі ў асноўным сходны з павер'ямі, якія бытуюць у іншых раёнах Украіны і Расіі [25, с.133]. На думку беларусаў-палешукоў, з'яўленне дэманалагічнай істоты русалкі адбывалася рознымі шляхамі. Існуюць павер'і, што русалкі – душы памершых дзяцей, якія нараджаюцца на свет нежывыя ці якія паміраюць нехрышчонымі: "Дзіця нехрышчонае як закапаюць – русалкай становіцца" (ПА, Ст.); "Нехрышчоныя дзяўчынкі як памруць – русалкі" (ПА, Лун.); "гэта душы дзяцей жаночага полу, што памерлі да хрышчэння" [27, с.196], "душы мёртванароджаных ці дзяцей, памершых нехрышчонымі" [9, с.12]; "памершыя нехрышчоныя дзеці беларусак" [30, с.406]; "душы дзяцей, памершых да хрышчэння ператвараюцца ў русалак" [2, с.77]; "дзеці, якія памерлі нехрышчонымі, робяцца пасля смерці русалкамі" [33, с.172].

З уяўленнямі беларусаў (дарэчы, як і іншых славянскіх народаў) аб русалках як аб душах памершых дзяцей, што былі нехрышчонымі, цесна ўзаемазвязаны перасцярогі, што бытавалі сярод людзей. Палешукі лічылі, што "покуль дзіця не хрышчана, яму не можна даваць імя, бо нечыстая сіла, пачуўшы тое імя, прычэпіцца к дзіцяці" [18, с.150]. Асабліва турбавала іх, калі такія дзеці паміралі, бо супакою ім не будзе. На Палессі існуе павер'е, што "душа дзіцяці, памёршага нехрышчоным, доўга не можа знайсці сабе супакою, яна ўсё пішчыць, усё просіць, каб хто яе ахрысціў і даў ёй імя. Такія душы нехрышчоных дзяцей на купальскую нядзельку часамі паказваюцца людзям. Іх няма чаго палохацца, бо яны нічога ліхога не зробяць, яны толькі просяць, каб іх перахрысцілі. Як хто ўбачыць такое дзіця, то трэба хутчэй зняць з сябе крыжык, накінуць на тое дзіця, перахрысціць яго і назваць па тры імёны мужчын і жанчын. Тады тая душа дзіцяці супакоіцца і пойдзе ў неба, а таму чалавеку будзе ва ўсім вельмі шанцаваць" [18, с.151].

Русалкамі, паводле вераванняў людзей, станавіліся і дзяўчыны (іншы раз – проста "людзі"), якія памерлі ці нарадзіліся на Русальным тыдні: "Кожная дзеўка, што памрэ ў Русальным тыдні, на том свеце жыве русалкаю" [34, с.186]; "Чалавек памрэ на тым тыдні, што русальны тыдзень, і становіцца гэтаю русалкаю" (ПА, Петр.); "Як памрэ хто на Траечным тыдні, то ўжо пераходзіць у русалку" (ПА, Лельч.). Душы дзяўчат-тапельніц, па ўяўленнях палешукоў,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ператвараліся ў русалак: "Русалкі – душы тапельніц" [9, с.12]; "Русалкі з тапельцаў атрымліваюцца" (ПА, Лельч.).

Нявесты, памёршыя да свайго вяселля, з'яўляліся яшчэ адной крыніцай, што папаўняла рады загадкавых істот: "Як дзеўка на шлюбе памрэ, то былі русалкі" (ПА, Пн.); "Як дзяўчына вяселле не зрабіла і памрэ, то русалка будзе" (ПА, Пн.); "Русалка – гэта дзяўчына, якая была нарачонаю, але не дачакалася шлюбу" [32, с.504]; "гэта дзяўчаты, што памерлі адразу пасля замужжа" [33, с.172]. Гэтымі дэманалагічнымі істотамі, на думку палешукоў, станавіліся і тыя, хто пакончыў жыццё самагубствам: "Русалкамі народ лічыць самагубцаў" [3, с.189], "У русалку замяніў народ душу маладой дзяўчыны, якая, пакінутая сваім каханым, пакончыла з жалю самагубствам" [25, с.134].

Па народных уяўленнях, катэгорыя тых нябожчыкаў, што памерлі ў маладым узросце, вельмі небяспечная, "паколькі менавіта такія памёршыя станавіліся "хадзячымі", г.зн. наведвалі жывых, трывожылі іх, палохалі, маглі нашкодзіць" [6, с.92]. Доказам гэтага можа служыць наступнае павер'е: "Толькі маладыя, нявенчаныя як памруць на Русальным тыдні, ці хлопец, ці дзеўка, то робяцца русалкамі. Ужо хаваюць і ўжо не плачуць, што памерла, а плачуць, што будзе хадзіць усё жыццё русалкай. Ужо душа яе будзе на гэтым свеце хадзіць. Выйдуць і будуць хадзіць, як жывыя. І хлопцы былі русалкі...каторы хлопец нявенчаны. Гэта ў іх толькі душы хадзілі. Так і колісь казалі: душа іх ужо не будзе ў зямлі, а будзе хадзіць па свету" (ПА, Лельч.).

На думку палешукоў, існуе непасрэдная сувязь русалкі з памёршымі: "Русалка – гэта смерць така, косы распушчаны, у белай сукенцы. То дух выходзіць чалавечы, потым у зямлю ідзе" (ПА, Пн.); "Старыя людзі казалі: памёршыя то становяцца, тыя, якія маладыя, ва ўзросце дзеўка або жанчына маладая – што на Русальным тыдні ці памерлі, ці нарадзіліся – яны існуюць у русалках" (ПА, Хойн.); "Яны (русалкі) з скідушаў. Як баба не даносіць ці так мёртвага родзіць – ужо яна" [16, с.217].

Калі гавараць наконт прыроды русалак, палешукі лічаць іх "нечысцю", дэманалагічнай істотай: "гэта дэман-прыгажуня" [29, с.47]; "таямнічая істота" [31, с.76]; "Русалкі дрэнныя людзі, як чэрці, вось так і русалкі... Русалкі з памёршымі маюць нейкую сувязь" (ПА, Ельск.); "Русалка – гэта ведзьма, можа адабраць малако ў кароў" (ПА, Петр,); "От русалка – дрэнны звер, паганая гэта зусім. На звера русалка падобна" (там жа).

У народзе існуе павер'е, што дэманалагічная чараўніца адразу знікае, калі заспявае певень. Расказваюць, што ў адным мястэчку ў "адну і тую ж пару года з'яўлялася жанчына з распушчанымі валасамі і ў белым доўгім адзенні. Хто б ні папаўся да гэтай жанчыны, ён робіцца яе ахвярай: яна водзіць яго па балотах, змучвае да апошняга і дабівае знясіленага, і ніхто не можа знайсці і слядоў яго. Але як толькі заспявае ў гэты час паблізу певень, жанчына ўмомант знікае" [28, с.449-450].

Згодна з агульнапашыраным павер'ем, дзейнасць нячыстай сілы доўжыцца на працягу ўсёй ночы, але абавязкова перапыняецца з першымі пеўнямі. Певень як міфалагічны вобраз мае непасрэдную сувязь з сонцам: як і сонца, певень "адлічвае" час. Ён уяўляецца беларусам вешчуном дня і святла. Таму лічылася, што спеў пеўня з'яўляецца магутнай магічнай перашкодай для дзейнасці нячысцікаў (у тым ліку і русалак).

Паколькі існуюць розныя павер'і аб тым, хто станавіўся русалкаю, і меркаванні наконт генезісу гэтага вобраза разнастайныя. Некаторыя лічылі, што русалкі – душы памёршых продкаў, другія – што гэта самазабойцы, тапельцы, дзеці, памёршыя нехрышчонымі. У сваіх даследаваннях Д.К.Зеленін размяжоўвае душы памёршых родзічаў і "заложных нябожчыкаў" [10, с.124]. "Аднак

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

гэтым не вычэрпваецца характар гэтага складанага вобраза, у якім вельмі яскрава прысутнічае і яго сувязь з прыродай, з лесам і вадою, з вясенне-летнімі абрадамі, з культам урадлівасці" [15, с.76].

Беларусы верылі, што разам з веснавым абуджэннем прыроды ажываюць і душы памёршых. У светапоглядах старажытных земляробаў культ продкаў і аграрная магія былі арганічна ўзаемазвязаны. Па старажытнаславянскіх вераваннях, мёртвыя, пераходзячы ў надземны свет, набывалі здольнасць уздзейнічаць на ўрадлівасць зямлі.

Зрокавы вобраз русалкі ў беларусаў часцей за ўсё ўяўляецца як вобраз чароўнай, прываблівай прыгажуні. Д.К.Зяленін адзначаў, што ва ўкраінскіх і беларускіх павер'ях русалкі ўяўляліся часцей прыгожымі, чым брыдкімі, хаця, "насуперак звычайнаму меркаванню, і маларусы таксама прызнаюць дзе-нідзе існаванне страшных і агідных русалак" [10, с.157]. С.М.Максімаў лічыў вобраз "вясёлых, свавольных і прываблівых істот" – найбольш старажытнымі і першабытнымі, а злых і помслівых істот з рысамі "пачварнай нечысці" – скажонымі пазнейшымі вераваннямі [11, с.115]. "Хаця ва Уладзімірскай губерніі і помняць яшчэ старажытных русалак і прызнаюць нават два іх роды (вадзяных, дамашніх), але ні адзін сорт з іх не адрозніваецца такімі пяшчотнымі, прываблівымі рысамі, як паўднёвыя іх сёстры" [11, с.119].

Вобраз такіх прыгожых, прываблівых дэманалагічных істот з'яўляецца "алітаратураным вобразам, які выйшаў далёка за межы міфалагічных вераванняў, стаў для сучаснага чалавека вобразам-стандартам, трывала ўвайшоўшым у масавае мастацтва і бытавыя ўяўленні" [15, с.90-91]. Гэты "апаэтызаваны вобраз-стандарт у значнай ступені засланіў сабой аб'ектыўнае вывучэнне сапраўды фальклорных супярэчлівых сведчанняў, звязаных з гэтым міфалагічным персанажам" [6, с.97].

На Беларускім Палессі можна выдзеліць тры асноўныя тыпы апісання знешнасці русалак:

1. "прыгажуні з чароўным і абаяльным абліччам";
2. "брыдкія, страшныя жанчыны";
3. нейтральны тып (дзяўчаты або жанчыны з распушчанымі валасамі).

Як адзначалася, палешукі, як і астатнія беларусы, уяўлялі русалак часцей за ўсё маладымі прываблівымі дзяўчынамі з доўгімі валасамі, у вяночках, голымі або ў белым адзенні: "русалкі паўстаюць дарослымі спелымі дзяўчатамі, з доўгімі русымі валасамі, якія ўвесь час распушчаныя" [27, с.196]; "русалкі як дзяўчаты... выйшлі з вады, у вяночках, пазаплятаныя, у белым плацейку" (ПА, Лельч.); "вечна юныя прыгажуні з чароўным і абаяльным абліччам...кожная з іх уяўляе істоту ў пару найлепшага росквіту дзявоцтва, і толькі вопытнае вока ўлоўлівае між імі розніцу ўзростаў пры жыцці... Русалкі маюць ласкавыя блакітныя вочы. Па далікатным, амаль празрыстым іх целе рассыпаюцца хвалістыя валасы русага колеру, якія растуць ад маленькай галавы да каленяў, у асобных русалак гэтыя валасы хутчэй падобныя на пасмачкі зялёнай тонкай асакі...Вечна вясёлыя, гуллівыя рагатушкі русалкі" [14, с.85-86]; "уяўляюцца прыгожымі жанчынамі, з распушчанымі доўгімі валасамі" [2, с.77]; "русалкі – маладыя прыгожыя жанчыны з доўгімі, да пят, косамі" [9, с.12]; "дэманпрыгажуня, з зялёнымі валасамі" [29, с.47]; "жанчыны надзвычайнага хараства, з поўнымі расцвілымі грудзямі, з расплеценымі валасамі, прыбраныя рознымі аздобамі і прыгожымі сукнямі, "вельмі чапурна" [32, с.504]; "русалкі прыгожыя, вечна юныя дзяўчаты; яны абаяльныя, і толькі зялёныя вочы і зялёныя валасы даказваюць, што гэта асобыя істоты. Твары русалак бледныя і носяць адбітак загадкавага смутку" [7, с.61], "русалку ўяўлялі прыгожай і маладой дзяўчынай з доўгімі белымі валасамі, прыбранымі кветкамі" [25, с.133].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Русалка ў вобразе "страшнай, брыдкай жанчыны" паўставала ва ўяўленнях палешукоў касматай, старой, пачварнай істотай з адвіслымі грудзямі: "Гэтыя русалкі старыя, з кульбакамі ў руках, пачварныя, брыдкія... злыя і панурыя" [14, с.89]; "Людзі, як жанчыны, толькі валасы доўгія, растрапаныя. У лесе жывуць, на могілках... Голыя, касматы-раскасматы" (ПА, Калінк.); "Як малпа, жанчына, страшна такая. Грудзямі можа задавіць" (ПА, Жытк.); "Русалкі ходзяць у Пятроўку па жыту... кудлаты, як ведзьма" (ПА, Ст.); "Русалкі з жалезнымі цыцкамі, зловяць і застрыкочуць... голыя, касматыя" (ПА, Ветк,); "Русалкі, як жанчыны, але рукі як лапы ў сабакі і шэрсць на целе... У іх цыцкі вялікія былі, калі сустрэне каго, то закідвае адну за плячо да другую – і шчакоча да смерці" (ПА, Петр.); "Русалка, нібыта, жанчына старая, такое абарванне ўсё (на ёй)... забівае цыцкаю вялікай. Цыцка жалезная. Такая старэнькая" (ПА, Ст.); "у яе цыцкі жалезныя, шылаватыя" [31, с.76]; "А то былі шчэ русалкі. Сама голая, страшная, валасы доўгія ў яе – цягнуцца па гоні, і ў яе, кажуць, усё, як у чалавека" [20, с.141-142]; "Гэта – дзеўка белая з вялікімі цыцкамі, з калматымі косамі" [33, с.179].

На думку палешукоў, абавязковай прыналежнасцю русалак быў таўкач або "прач", "пральнік", "батог", "качарга": "У маі месяцы, раніцай, перад усходам сонца, калі добрае надвор'е, выходзяць адтуль (са дна рэк ) і голыя, са сваімі таўкачамі, скачуць у жыце і пяюць. Аднак яны паяўляюцца для сваіх скокаў не ў кожным жытнёвым полі, а толькі выключна ў тым, якое займае значную плошчу" [26, с.126]; "Яна (русалка) у ступу цябе ўсадзіць і таўкачом (стаўчэ)... У яе наконт таўкача – то цыцка, гэтаю цыцкаю цябе затаўчэ там, у той ступе" (ПА, Бяр.); "У полі русалка сядзіць з пральнікам, доўгія косы і пральнік у руках – і бяжыць за дзеткамі" (ПА, Лун.); "Русалка доўгая, кашматая, рубаха на ём, з таўкачом (у руках), можа стаўчы..." (ПА, Ст.).

Адзінкавыя пасведчанні адлюстроўваюць русалку вымазанай дзёгцем або смалою ("зловіць да цыцку смаляную дае"). У гэтай сувязі цікавая тэрміналогія назвы русалкі, зафіксаваная ў вёсцы Радчыцк Столінскага раёна – "смалянка" ("смулянка"): "Смулянка-то тое самае, што гэтая русалка..." Палохалі хлопцаў: "Смалянка вас забярэ!"; "У жыце смулянка сядзіць... у яе жалезна ступа і таўкач. Возьме ў жалезну ступу ды патаўчэ".

Пры апісанні нейтральнага тыпу русалак увага акцэнтуецца на іх доўгіх валасах, вянках і адзенні. Разглядаючы гэтыя дэманалагічныя істоты, трэба адзначыць, што некаторыя з іх напаміналі прыгожых дзяўчат, другія – страшных істот: "Заўсёды іх бачылі голымі, з доўгімі распушчанымі чорнымі валасамі і такога ж колеру вачыма" [30, с.406]; "народ уяўляе яе як сапраўдную дзяўчыну, бледную, з распушчанымі валасамі, якая вечна маўчыць... гэта таямнічая істота павінна мець на сабе залацістае адзенне, ад якога зыходзіць такі бляск, што яго ніводнае чалавечае вока не можа вытрымаць... "што аж папрэ слёзы, як глянеш на яе" [31, с.75-76]; "ходзяць заўсёды голыя, з доўгімі валасамі" [3, с.189]; "ходзіць на галаве з вянком голая, штоб відна было, што яна яшчэ не саграшыла" [34, с.186]; "русалкі з доўгімі валасамі ходзяць па жыце" [33, с.172]; "косы распушчаны, маладая, нестарая, апранутая нібы ў ніжняе адзенне» (ПА, Ст.); "русалка валасатая, з закрытымі вачамі і ў белым адзенні" (ПА, Петр.).

Сустракаюцца на Палессі і адзінкавыя ўяўленні аб русалках як істотах з крыламі: "русалкі з крыламі, без сарочак, голыя, косы русыя па пояс" [22, с.251]. Русалка з крыламі ўяўляецца палешукам як ахоўніца ўрадлівасці глебы, якая спрыяла ўраджайнасці збожжа. Яна тут выступае прадстаўніком адной з важнейшых стыхій – Вады, без якой, як і без Сонца і Агню, не можа існаваць жыццё.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Такое ўяўленне дае падставу меркаваць, што на Беларускім Палессі міжволі спалучалі праз вобраз русалкі Зямлю і Неба. Крылы ў русалак надавалі апошнім магчымасць узнімацца ў паднябессе і паліваць самім нівы дажджавымі кроплямі або быць пасрэднікамі паміж людзьмі і творцам жыцця Стрыбогам у час аграрнамагічных дзеянняў па вызыванні дажджу.

Увогуле, міфалагічны вобраз русалкі разнастайны: "тут і ўвасабленне воднай стыхіі (русалка любіць завабіць у ваду і тапіць людзей), і ўяўленні аб загінуўшых у вадзе жанчынах, дзяўчатах, аб нехрышчоных памёршых дзецях (нячыстых памёршых), і вераванні аб духах пладавітасці (русалкі ў паўднёвавелікарускіх вераваннях гуляюць у жыце, качаюцца па траве і тым самым даюць ураджай хлеба, ільну, каноплі і інш.)" [24, с.213]. Пры ўсёй варыятыўнасці вобраза русалкі... можна выдзеліць найболей хадавы, умоўна гаворачы, класічны вобраз русалкі – ракавой для чалавека прыгажуні, вадзяной, радзей лясной, нечысці [15, с.78].

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Баршчэўскі Ян.*** Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. – Мінск, 1990.
2. ***Богданович А.Т.*** Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: Этногр. – Гродно, 1895.
3. ***Булгаковский Д.Г.*** Пинчуки...// Зап. Ишп. Рус.геогр.о-ва по отделению этнографии. – СПб., 1890. – Т. 13. – Вып.3.
4. ***Васильева А.Я.*** Легенды и поверья в Минской губернии // Минские губернские ведомости. – 1879. – № 11.
5. ***Веселовский А.Н.*** Разыскания в области славянской филологии, вып. XXV.
6. ***Виноградова Л.Н.*** Мифологический аспект полесской "русальной" традиции // Славянский и балканский фольклор. – М., 1986.
7. ***Гальковский Н.М.*** Борьба христианства с остатками язычества в Древней Руси. – Харьков, 1916. – Т.1.
8. ***Даль Вл.*** Толковый словарь живого великорусского языка. – М.,1955. – Т. IV.
9. Живая старина. – 1908, Вып. 1.
10. ***Зеленин Д.К.*** Очерки русской мифологии. – П-г., 1916.
11. ***Максимов С.В.*** Нечистая сила – неведомая сила. – Собр. Соч. – СПб., 1912. – Т. 18.
12. ***Маринов Д.*** Народна вера и религиозни обичаи. – София, 1914.
13. Мифы народов мира. – М., 1982. – Т. 2.
14. ***Никифоровский Н.Я.*** Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. – Вильна, 1907.
15. ***Померанцева Э.В.*** Мифологические персонажи в русском фольклоре. – М., 1975.
16. ***Романов Е.Р.*** Белорусский сборник. Вып.4. – Витебск, 1891.
17. ***Рыбаков Б.А.*** Язычество Древней Руси. – М., 1987.
18. ***Сержпутоўскі А.*** Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. – Мінск, 1930.
19. Словарь русского языка. – М., 1959. - Т. 111.
20. ***Сысоеў У.М.*** З крыніц спрадвечных. – Мінск, 1997.
21. ***Тайлор Э.Б.*** Первобытная культура. – М.,1989.
22. Тураўскі слоўнік, ч.1. – Мінск, 1982.
23. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. – Мінск, 1982.
24. ***Токарев С.А.*** Религия в истории народов мира. – М., 1986.
25. ***Шаховіч М.*** Дэманічныя постаці і з'явы ў народным вераванні на стыку польскай і беларускай культур // Мост праз стагоддзі: Зб. Навук. прац. – Беласток, 1982.
26. ***Шейн П.В.*** Белорусские народные песни... – СПб., 1874.
27. ***Шейн П.В.*** Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1, ч.1 // Сборник отделения русского языка и словесности АН. – СПб., 1887. – Т. 41. – № 3.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

28. ***Шейн П.В.*** Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. – СПб., 1893. – Т.2.
29. ***Эремич И.*** Очерки Белорусского Полесья. – Вильна, 1868.
30. ***Czarnovska M.*** Zabytki miiitologii slowianskiej w zwjczajach wiejskiego ludu na Bialej Rusi dochowywanee.[Gub. Mohiltwska] // Dziennik Wilenski. – 1817. – T. 6. – № 34.
31. ***Federowskl M.*** Lud Bialoruski na Rusi Litewski. T. – Krakow, 1897.
32. ***Jelenska E.*** Wies Komarowicze w powiece Mozyrskiv // Wisla.1891. – T. 5.
33. ***Moszynskl K.*** Polesie wschodnie. – Warszawa, 1928.
34. ***Pietkiewicz Cz.*** Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego: Materjaly etnografiezne. – Warszawa, 1938.

## *ПРЫНЯТЫЯ СКАРАЧЭННІ*

ПА – Полесский архив. Материалы экспедиций Ин-та славяноведения и балканистики АН СССР, проводимых под руководством Н.И.Толстого.

## *СПІС СКАРАЧЭННЯЎ*

Бяр. – Бярозаўскі
Ветк. – Веткаўскі
Ельск. – Ельскі
Жытк. – Жыткавіцкі
Калінк. – Калінкавіцкі
Лельч. – Лельчыцкі
Лун. – Лунінецкі
Петр. – Петрыкаўскі
Пн. – Пінскі
Ст. – Столінскі
Хойн. – Хойніцкі

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова